Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# КУПАЛІНКА

музычная карагодная гульня
па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню
для дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту.

Карагодная гульня “Купалінка”

Задачы: практыкаваць ва ўменні ўзгадняць рухі са словамі песні; выхоўваць пачуццё павагі да традыцыйных беларускіх святаў, пачуццё калектывізму.

Абсталяванне: вянок з кветак.

Гульнёвыя правілы: з удзельнікаў гульні выбіраецца Купалінка. Астатнія дзеці становяцца ў карагод. Купалінка становіцца ў сярэдзіну карагода.

Методыка правядзення: пад словы беларускай народнай песні «Купалінка»

Купалінка-купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка (дзеці рухаюцца па крузе)

Пад словы

Мая дочка ў садочку ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць,
Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць.
Кветачкі рвець, кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае, слёзкі пралівае,
Вяночкі звівае, слёзкі пралівае. (Купалінка выконвае рытмічныя рухі, а дзеці пляскаюць у далоні. Па заканчэнні тэкста Купалінка перадае вынок іншаму гульцу. Той выконвае ролю Купалінкі).

Гульня паўтараецца 2-3 разы